## Інфармацыйны ліст

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь запрашае прыняць удзел у Міжнародным конкурсе праектаў **«Беларусь і Кітай: Мост у будучыню»** сярод навучэнцаў Беларусі і Кітая ад 15 да 18 гадоў.

Конкурс праводзіцца з мэтай развіцця цікавасці да бесперапыннай адукацыі, стымулявання асобаснага і інтэлектуальнага развіцця праз выкарыстанне магчымасцяў сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Асноўнымі задачамі конкурсу з'яўляюцца наступныя:

- стварэнне асяродку для асобаснага і інтэлектуальнага развіцця навучэнцаў;
- стымуляванне цікавасці да навучальнай дзейнасці;
- спрыянне развіццю камп'ютарнай граматнасці ўдзельнікаў;
- садзейнічанне ў прафесійным самавызначэнні навучэнцаў;
- стварэнне асяродку для сяброўства і ўзаемадзеяння ўдзельнікаў

Удзельнічаць у конкурсе могуць навучэнцы Беларусі і Кітая **ад 15 да 18 гадоў**.

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна **з 17 чэрвеня па 14 кастрычніка 2019 года** падаць заяўку па ўстаноўленай форме і накіраваць разам з ёй праект на электронны адрас: olimp@adu.by.

Заяўка
на ўдзел у Міжнародным конкурсе праектаў
«Беларусь і Кітай: Мост у будучыню»

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| Дата нараджэння | |
| Дамашні адрас | |
| Кантактны тэлефон | |
| Электронная пошта | |
| Назва праекта | |
| Форма прэзентацыі праекта | |

Сваёй заяўкай удзельнік пацвярджае сваё аўтарства і згоду з умовамі правядзення конкурсу. Заяўка, афармленая не па форме, разглядацца не будзе.

Удзельнік конкурсу рыхтуе праект на адну з прапанаваных тэм па выбары:

*для кітайскіх удзельнікаў:*

«Што я ведаю пра Беларусь?»;

«Чаму я хачу вывучаць беларускую мову?»;

«Чаму я хацеў бы / хацела б вучыцца ў Беларусі і дзе?»;

«Мая будучая прафесія»;

«Мае беларускія сябры»;

*для беларускіх удзельнікаў:*

«Што я ведаю пра Кітай?»;

«Чаму важна ведаць кітайскую мову?»;

«У якой навучальнай установе нашай краіны я хацеў бы / хацела б вучыцца?»;

«Мая будучая прафесія»;

«Мае кітайскія сябры»;

Творчая работа павінна ўтрымліваць кароткія звесткі пра сябе (фатаздымак (па жаданні), узрост, краіна пражывання, сфера інтарэсаў і інш.).

**Форма прадстаўлення праекта** можа быць любой (буктрэйлер, фотазамалёўка, прэзентацыя, сачыненне, нарыс, эсэ і г.д.).

**Тэхнічныя патрабаванні да праектаў:**

- набор тэксту пісьмовай работы ажыццяўляецца з выкарыстаннем тэкставага рэдактара Word; рэкамендуецца выкарыстоўваць шрыфты тыпу Times New Roman памерам 14 пунктоў; міжрадковы інтэрвал – адзінарны; устанаўліваюцца наступныя памеры палёў: верхняга і ніжняга – 20 мм, левага – 30 мм, правага – 10 мм; шрыфт друку павінен быць прамым, светлага контуру, выразным, чорнага колеру, аднолькавым па ўсім аб'ёме тэксту; аб'ём пісьмовай работы не павінен перавышаць 6 старонак;
- у фармаце відэароліка: працягласць – не больш за 5 хвілін; максімальнае разрозненне відэа – 1280x720 пікселяў; дапушчальныя фарматы відэафайла – AVI, DivX, MPEG, WMV, MP4; максімальны аб'ём гатовага файла – не большы за 50 Мб;
- у фармаце фатаграфій: фармат файла: JPEG, PNG; максімальны памер па шырокім баку – 2500 пікселяў; максімальнае разрозненне – 150 dpi; дапушчальны аб'ём кожнай фатаграфіі – не большы за 8 Мб;
- у фармаце прэзентацый: файлы з пашырэннем PPT, PPS, PPTX, PPSX, PDF; максімальны аб'ём – не большы за 10 Мб; максімальная колькасць слайдаў у прэзентацыі – не большая за 15.

Да ўдзелу ў Конкурсе не дапускаюцца работы, якія не адпавядаюць акрэсленым вышэй патрабаванням.

**Кантакты аргкамітэта:**
220004, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, вул. Караля, д. 16, п. 325;
тэлефоны: +375 17 229 19 67;
+375 17 229 19 65 Ірына Уладзіміраўна Борычава; Дар'я Віктараўна Жвалеўская
**e-mail**: olimp@adu.by